УДК 37.013:811.161.3

# ПАДРУЧНІК БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ КАШТОЎНАСНЫХ АРЫЕНТАЦЫЙ НАВУЧЭНЦАЎ

*Андрэйчык В. І.*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*ДУА "Акадэмія адукацыі"*

***Анатацыя.*** *У артыкуле аналізуюцца метадычныя сродкі фарміравання каштоўнасных арыентацый у падручніках па беларускай мове для X–XI класаў як спосаб станаўлення асобы навучэнца – носьбіта нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей.*

***Ключавыя словы:*** *каштоўнасныя арыентацыі; аксіялагічны патэнцыял; падручнік беларускай мовы; дзяржаўныя асноватворчыя дакументы.*

***Уводзіны.*** На сённяшні дзень сацыяльна-культурныя і эканамічныя трансфармацыі ў сферы адукацыі абумоўліваюць павышаную ўвагу да фарміравання ў навучэнцаў устойлівай сістэмы каштоўнасных арыентацый як асновы гарманічнага развіцця асобы. У сувязі з гэтым перад сістэмай адукацыі ставіцца задача: забяспечыць якасную перадачу ведаў і выхаваць маладое пакаленне, якое ўсведамляе сваю ролю ў грамадстве і кіруецца ўстойлівай сістэмай каштоўнасных арыентацый.

Сістэма каштоўнасных арыентацый навучэнцаў уяўляе сабой надзвычай складаную шматмерную з’яву, якая фарміруецца пад уздзеяннем розных сфер зносін. Менавіта каштоўнасці вызначаюць паводзіны і ўчынкі асобы, яе адносіны да грамадства, да самой сябе, да розных жыццёвых сітуацый і да пазнавальнай дзейнасці.

Як адзначаюць Г. І. Нікалаенка і І. У. Таяноўская "*каштоўнасна-арыентаваная падрыхтоўка навучэнцаў будуецца з улікам ключавых для асобы і соцыуму духона-маральных паняццяў і катэгорый, пры гэтым павінна быць узаемнае змяшчэнне і ўзаемадзеянне асобасных сэнсаў, каштоўнасных перакананняў, норм развважанняў і паводзін*" [1, с. 58]. У гэтым кантэксце варта адзначыць, што, беларуская мова з’яўляецца носьбітам нацыянальнай культуры і гістарычнай памяці, адлюстроўвае патрабаванні грамадства на выхаванне асобы з выражанай каштоўнасна-арыентацыйнай пазіцыяй, здольнай да маральнага выбару і грамадзянскай адказнасці.

У гэтай сувязі ***актуальнасць даследавання*** абумоўлена неабходнасцю выяўлення аксіялагічнага патэнцыялу структурных кампанентаў сучасных падручнікаў па беларускай мове як асноўнага сродку навучання і выхавання асобы, здольнага забяспечваць мэтанакіраванае фарміраванне нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей навучэнцаў.

***Мэта артыкула –*** вызначыць аксіялагічны патэнцыял структурных кампанентаў сучасных падручнікаў па беларускай мове для X–XI класаў і прааналізаваць рэалізаваныя ў іх змесце метадычныя сродкі фарміравання каштоўнасных арыентацый навучэнцаў.

Тэарэтычную аснову даследавання складаюць дзяржаўныя асноватворчыя дакументы Рэспублікі Беларусь (Кодэкс аб адукацыі, Адукацыйны стандарт агульнай сярэдняй адукацыі, Стратэгія дзяржаўнай моладзевай палітыкі да 2030 года, вучэбныя праграмы і падручнікі па беларускай мове для X–XI класаў), навуковыя даследаванні ў галіне аксіялагічнай адукацыі і методыкі навучання беларускай мове (Л. С. Васюковіч, Г. М. Валочка, Г. І. Нікалаенка, І. У. Таяноўская, В. Ф. Русецкі, В. У. Зелянко і інш.).

Для дасягнення мэты даследавання выкарыстаны наступныя ***метады і матэрыялы:*** аналіз навуковых крыніц, параўнальны аналіз зместу дзяржаўных асноватворчых дакументаў, адукацыйных праграм і падручнікаў, метад сінтэзу для сістэматызацыі тэндэнцый.

***Вынікі і іх абмеркаванне.*** У дзяржаўных асноватворчых дакументах Рэспублікі Беларусь замацаваны стратэгічныя арыенціры выхавання і каштоўнасныя арыентацыі, якія неабходна мэтанакіравана фарміраваць у навучэнцаў пры навучанні беларускай мове. Сярод галоўных накірункаў палітыкі ў сферы адукацыі вызначаецца "*прыярытэт агульначалавечых каўтоўнасцей, правоў чалавека, гуманістычны характар адукацыі*" [2, с. 14].

Стратэгічныя напрамкі дзяржаўнай моладзевай палітыкі Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2030 года скіраваны на падтрымку самарэалізацыі маладога пакалення і забеспячэнне ўмоў для фарміравання маральна сталай, сацыяльна адказнай і грамадска актыўнай асобы. У якасці

прыярытэтных каштоўнасных арыентацый вызначаюцца грамадзянскасць, патрыятызм, развіццё творчага і прафесійнага патэнцыялу, адказнае стаўленне да ўласнага здароўя, а таксама ўмацаванне культурных і сямейных каштоўнасцей [3].

Зафіксаваныя на дзяржаўным узроўні каштоўнасныя прыярытэты рэалізуюцца ў педагагічнай практыцы. Аналіз адукацыйнага стандарта сведчыць пра яго сістэмную накіраванасць на фарміраванне цэласнай каштоўнаснай карціны свету навучэнцаў. Праз інтэграцыю аксіялагічных кампанентаў забяспечваецца духоўнае, сацыяльнае і інтэлектуальнае станаўленне асобы. Змест моўнай адукацыі скіраваны на фарміраванне нацыянальных, агульначалавечых і асобасных каштоўнасцей [4, с. 109–111].

Змест каштоўнасных арыентацый, замацаваны сучаснымі адукацыйнымі стандартамі, знаходзіць сваё ўвасабленне ў вучэбных праграмах па беларускай мове. Праграмы функцыянуюць як сродак рэалізацыі патрабаванняў стандарту ў педагагічнай практыцы, забяспечваюць мэтанакіраванае фарміраванне сацыякультурнай і лінгвакультуралагічнай кампетэнцый навучэнцаў. Асноўны акцэнт праграм робіцца на дасягненне асобасных вынікаў, сярод якіх засваенне культурных, маральных і сацыяльных каштоўнасцей [5].

Сучаснае кампетэнтнасна арыентаванае навучанне патрабуе не толькі засваення ведаў, але і іх трансфармацыі ў асабісты вопыт навучэнцаў. Гэта адбываецца праз рэфлексію, маральны выбор, асэнсаванне такіх каштоўнасцей, як патрыятызм, грамадзянскасць, павага да гісторыі, роднай мовы і культуры, якія складаюць духоўна-маральную аснову беларускага грамадства. Сфарміраваныя каштоўнасныя арыентацыі вызначаюць адказныя паводзіны асобы і сведчаць пра “*гатоўнасць да прымянення ў розных жыццёвых сітуацыях атрыманых ведаў і сфарміраваных уменняў*” [6, с. 16].

Вядучыя моваазнаўцы-метадысты (Н. П. Баранава, Г. М. Валочка, А. А. Гулецкая, В. У. Зелянко, В. Ф. Русецкі, В. І. Цірынава, М. Г. Яленскі і інш.) акцэнтуюць увагу на важнасці сістэмнага прымянення навучальных сродкаў, якія спрыяюць развіццю ўніверсальных кампетэнцый. Кампетэнцыі, што ўключаюць сінтэз ведаў, навыкаў і каштоўнасна-сэнсавых установак, з’яўляюцца фундаментам для паспяховай сацыяльнай адаптацыі і творчай самарэалізацыі асобы. Працэс станаўлення каштоўнасных арыентацый патрабуе інтэнсіўнага ўключэння навучэнцаў у дзейнасць, якая забяспечвае не проста актуалізацыю інфармацыі, але і набыццё досведу маральнага выбару, эмацыянальнага перажывання і ўсвядомленага фарміравання асабістай аксіялагічнай сістэмы.

Менавіта метадычныя сродкі навучання беларускай мове выконваюць ролю таго “працэсуальнага блока”, які забяспечвае сувязь паміж ведамі, дзейнасцю і іх “пераўтварэннем” у каштоўнасна арыентаваны асабісты вопыт навучэнцаў праз аналіз, развагу, параўнанне, праектаванне заданняў. Падчас сістэматычнай і мэтанакіраванай дзейнасці забяспечваецца пераход ад фармальнага выканання аперацый да асэнсаванага асабіста значнага навучання, накіраванага на духоўна-маральнае развіццё навучэнца.

Звернемся да зместу падручнікаў па беларускай мове, у якіх зададзеныя стандартам і праграмамі каштоўнасныя арыентацыі набываюць канкрэтнае дыдактычнае ўвасабленне праз вучэбныя тэксты і ўмовы заданняў. Нягледзячы на ўсе метадычныя навацыі, падручнік захоўвае статус асноўнага навучальнага сродку. Аксіялагічны кампанент зместу адукацыі рэалізуецца праз структурныя элементы падручніка: *асноўны тэкст* вучэбных дапаможнікаў; *дадатковы тэкст*; *невербальны кампанент*; *знешнія крыніцы інфармацыі*. Разгледзім, якім чынам названыя кампаненты рэалізуюцца ў сучасных падручніках, акцэнтуючы ўвагу на аксіялагічным напаўнені прапанаваных заданняў.

Ступень інтэграцыі каштоўнаснага кампанента ў названых метадычных сродках падручнікаў неаднародная, што патрабуе колькаснага абгрунтавання. З гэтай мэтай праведзены аналіз матэрыялаў падручнікаў па беларускай мове для X і XI класаў (аналізаваліся выданні апошніх гадоў). Агульная колькасць практыкаванняў у абодвух падручніках складае 617, сярод якіх 166 (26,9 %) накіраваны на фарміраванне каштоўнасных арыентацый навучэнцаў.

Найбольшую групу заданняў складаюць заданні творчага характару (155 адзінак, 25,1 % ад агульнай колькасці): 34,8 % з іх валодаюць аксіялагічнай скіраванасцю, што ў агульнай структуры практыкаванняў складае 8,8 %. Гэтыя паказчыкі дазваляюць разглядаць творчыя заданні як

найбольш прадуктыўную форму ўключэння каштоўнаснага зместу ў адукацыйны працэс, паколькі яны стымулююць самавыяўленне асобы і рэфлексійнае асэнсаванне маральных паняццяў.

Высокі ўзровень аксіялагічнай насычанасці (62,5 %) зафіксаваны ў заданнях, скіраваных на стварэнне навучэнцамі ўласных тэкстаў (64 заданні, 10,4 % ад агульнай колькасці); у агульнай структуры метадычнага апарату падручніка іх доля складае 6,5 %.

Заданні з QR-кодамі складаюць 23,5 % ад агульнай колькасці (145 заданняў). Умовы, у якіх прапануецца навучэнцам праца з інтэрнэт-крыніцамі, складаюць 2,3 % ад агульнай колькасці заданняў. Атрыманыя дадзеныя сведчаць пра патэнцыял электронных рэсурсаў як дадатковай платформы фарміравання каштоўнаснага зместу: выкарыстанне разнастайных формаў падачы інфармацыі (аўдыя, відэа, візуальныя эфекты) пашырае магчымасці ўспрымання і ўзмацняе эмацыянальнае ўздзеянне на асобу навучэнца. Разам з тым рэалізацыя гэтага патэнцыялу патрабуе мэтанакіраванай распрацоўкі электроннага кантэнту з выразна заяўленай аксіялагічнай скіраванасцю.

*Тэкставы матэрыял* школьных выданняў *(тэксты параграфаў, фармулёўкі правіл, фрагменты для чытання і разважання і інш.)* выконвае ролю цэнтральнага ядра, праз якое забяспечваецца засваенне вучэбнага зместу. Змест вучэбных тэкстаў падручнікаў па беларускай мове насычаны аксіялагічным патэнцыялам, аднак для рэалізацыі гэтага патэнцыялу патрабуецца спецыяльна арганізаваная, мэтанакіраваная пазнавальная дзейнасць. Для эфектыўнага фарміравання каштоўнасных арыентацый варта выкарыстоўваць праблемныя тэксты, якія актуалізуюць творчае, крытычнае мысленне. У гэтым аспекце праца з метатэкстам можа дапаўняцца дадатковымі заданнямі, напрыклад: *“Расказваючы пра жыццё, творчасць людзей або звяртаючыся да ўласных вытокаў, мы з пяшчотай узгадваем свае родныя мясціны, называючы іх малой радзімай. Васіль Жуковіч пярэчыць гэтаму ўстойліваму выразу. Пракаменціруйце пазіцыю паэта. Спішыце тэкст, пастаўце знакі прыпынку. Вусна вызначце тып сказаў”* [7, с. 166].

З прапанаваных у падручніках практыкаванняў найбольш спрыяюць фарміраванню каштоўнасных арыентацый творчыя заданні, яны накіроўваюць навучэнцаў не толькі на авалоданне ведамі, але і на развіццё эмпатыі, маральна-ацэначнага мыслення і гатоўнасці выкарыстоўваць атрыманыя веды на практыцы. Напрыклад: *“Падрыхтуйце вуснае выказванне на тэму “Роля беларускай мовы ў жыцці чалавека і грамадства”* [8, с. 9].

*Дадатковыя тэксты (даведачная інфармацыя, інфармацыйныя рубрыкі, спасылкі і інш.)* як структурныя кампаненты падручніка выконваюць удакладняльную і тлумачальную функцыі. У сучасных падручніках па беларускай мове яны прадстаўлены праз рубрыкі “Звярніце ўвагу”, “Паслухаем мовазнаўцаў”, “Дакладнасць маўлення”, “Гавары і пішы правільна” [7; 8]. У кантэксце сучасных адукацыйных задач па фарміраванні каштоўнасных арыентацый бачыцца мэтазгодным разгледзець патэнцыял рубрык як сродку для ўключэння навучэнцаў у рэфлексійную і праблемна-пошукавую дзейнасць. Да прыкладу, у рубрыцы “Паслухаем мовазнаўцаў” (“Беларуская мова”, XI клас, электронны дадатак) прыводзяцца разважанні мовазнаўцаў пра моўныя штампы: *“Штамп – шматразова паўтораны, механічна пазычаны, зашмальцаваны, надакучлівы выраз – з’яўляецца сур’ёзнай стылістычнай памылкай. Гэта сведчанне моўнай бездапаможнасці і лянoты думкі (В. Ляшук)”*. Падобныя матэрыялы спрыяюць ўсведамленню ролі набыткаў мовазнаўцаў-навукоўцаў, выхаванню павагі да суразмоўцы, адказнага стаўлення да мовы і культуры камунікацыі.

*Невербальны кампанент падручніка (ілюстрацыі, схемы, табліцы, фатаграфіі, стужкі часу, мастацкія рэпрадукцыі і інш.)* разглядаецца не толькі як ілюстратыўнае дапаўненне да асноўнага тэксту, але і як значны рэсурс для развіцця каштоўнасных арыентацый навучэнцаў праз уключэнне іх у праблемна-творчую і інфармацыйна-пошукавую дзейнасць. Прыкладам з’яўляецца заданне, у якім навучэнцам прапануецца, карыстаючыся ілюстрацыйным матэрыялам (карта з гербамі і датамі ўзнікнення гарадоў – сталіц Дня беларускага пісьменства) і інтэрнэт-рэсурсамі, аднавіць прапушчаныя ў тэксце сказы, выдзеленыя курсівам [7, с. 42]. Падобныя заданні арганічна спалучаюць вербальны і невербальны кампаненты, патрабуюць скаардынаванай працы з тэкстам і візуальным аб’ектам, пошуку і адбору дадатковай інфармацыі, яе аналізу і ацэнкі.

У кантэксце фарміравання каштоўнасных арыентацый спасылкі на *знешнія інфармацыйныя рэсурсы (інтэрнэт-крыніцы, інтэрактыўныя заданні, QR-коды),* змешчаныя ў падручніках па беларускай мове, набываюць значэнне важнага інструмента інтэлектуальнага і духоўна-маральнага развіцця навучэнцаў. Напрыклад, заданні па падрыхтоўцы паведамленняў пра матэрыялы выдання

“Спадчына Беларусі”, пра помнікі, прысвечаныя гістарычным асобам і гераічнай абароне Брэсцкай крэпасці [7, с. 27, 55, 92], пра функцыянаванне беларускай мовы ў інтэрнэце, культуру беларускага маўлення [7, с. 9, 30] і інш. Падобныя заданні садзейнічаюць паглыбленню разумення ролі мовы, культуры, патрыятызму і гістарычнай памяці ў жыцці беларускага грамадства і ўмацаванню ў навучэнцаў адказнага стаўлення да нацыянальных каштоўнасцей.

Для максімальна поўнага ўвасаблення аксіялагічнага патэнцыялу, які змяшчаецца ў знешніх інфармацыйных рэсурсах як сродках выхавання каштоўнаснай сферы вучняў, патрабуецца планамернае і грунтоўнае ўдасканаленне метадычнага інструментарыю. Эфектыўным спосабам інтэграцыі такіх крыніц у структуру працэсу фарміравання каштоўнасных арыентацый выступае выкарыстанне сістэмы праблемна-пошукавых і крэатыўных заданняў, якія спрыяюць якаснай трансфармацыі пазіцыі навучэнца: ад пасіўнага атрымальніка звестак да актыўнага суб’екта. Навучэнец набывае здольнасць самастойна акрэсліваць праблемныя пытанні, выпрацоўваць аптымальныя стратэгіі іх вырашэння, весці даследчую дзейнасць і праяўляць ініцыятыву ў сацыяльна-камунікатыўным асяроддзі, усведамляючы сябе носьбітам і захавальнікам культурнай спадчыны беларускага народа.

Уключэнне знешніх крыніц інфармацыі ў адукацыйны працэс патрабуе павышанай увагі да методыкі работы з электроннымі вучэбнымі тэкстамі, якія фарміруюць новы тып камунікатыўна-дзейнаснага вопыту ў навучэнцаў. У кантэксце сучаснай лічбавай рэальнасці, што істотна ўплывае на працэсы сацыялізацыі маладога пакалення, асабліва актуальным становіцца думка Л. С. Васюковіч: “*Лічбавая рэальнасць як сфера дзейнасці і зносін становіцца для сучаснага дзіцяці адным з ключавых фактараў паспяховай сацыялізацыі. Ігнараванне гэтага факта можа паглыбіць разрыў паміж асаблівасцямі лічбавага пакалення і сучаснай школы*” [9, с. 49].

***Заключэнне.*** Такім чынам, дзяржаўныя асноватворчыя дакументы вызначаюць фарміраванне каштоўнасных арыентацый як важную задачу сучаснай беларускай школы. Сучасныя падручнікі па беларускай мове для X–XI класаў у цэлым адпавядаюць дзяржаўным прыярытэтам каштоўнаснага выхавання і забяспечваюць сістэмную інтэграцыю агульначалавечых, нацыянальных і асобасных каштоўнасцей у змест моўнай адукацыі.

Праведзены аналіз спосабаў уключэння метадычных сродкаў у працэс фарміравання каштоўнасных арыентацый пры навучанні беларускай мове ў X–XI класах дазваляе сфармуляваць наступныя высновы.

Па-першае, сучасныя падручнікі ў цэлым адлюстроўваюць аксіялагічную сферу грамадства і фарміруюць асобасныя адносіны навучэнцаў да нацыянальна і сацыяльна значных каштоўнасцей. Метадычныя сродкі выданняў выступаюць працэсуальным блокам, які забяспечвае пераход ад рэпрадуктыўнай дзейнасці да назапашвання асобасна значнага, каштоўнасна насычанага вопыту навучэнцаў.

Па-другое, эфектыўнасць фарміравання каштоўнасных арыентацый залежыць ад паслядоўнасці выкарыстання аксіялагічнага патэнцыялу тэкстаў, рубрык, ілюстрацый і знешніх рэсурсаў. Разам з тым у падручніках назіраецца пэўны метадычны дысбаланс: пераважаюць заданні інфармацыйна-пошукавага і рэпрадуктыўнага характару, якія недастаткова актывізуюць эмацыянальнае перажыванне і рэфлексійнае асэнсаванне каштоўнасцей.

Па-трэцяе, фарміраванню каштоўнасных арыентацый спрыяе ўзбагачэнне метадычнага апарату заданнямі прадуктыўнага, праблемнага і рэфлексійнага характару, якія стымулююць навучэнцаў да аналізу і параўнання поглядаў, абгрунтавання ўласнай пазіцыі, эмацыянальнага перажывання каштоўнасцей і фармулявання асобасных сэнсаў. Інтэграванай асновай гэтага працэсу выступае не набор асобных тэкстаў ці практыкаванняў, а цэласнае культурнае асяроддзе, у каардынатах якога адбываецца станаўленне асобы з устойлівай сістэмай каштоўнасных адносін да свету і людзей.

Спіс літаратуры

1. Нікалаенка, Г. Навукова-метадычныя аспекты працэсу семантызацыі духоўна-маральных паняццяў і катэгорый: з вопыту рэалізацыі інавацыйнага праекта / Г. Нікалаенка, І. Таяноўская, М. Варакса, Т. Пашковіч // Роднае слова. – 2024. – № 3. – С. 58–63.

2. Кодекс Республики Беларусь об образовании : от 13 января 2011 г. № 243-З : по состоянию на 1 сент. 2022 г. // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – URL: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=hk1100243 (дата обращения: 14.05.2026). – Текст : электронный.

3. Об утверждении образовательных стандартов общего среднего образования : постановление М-ва образования Респ. Беларусь, от 28 нояб. 2025 г., № 199 // Национальный образовательный портал. – URL: https://adu.by/images/2025/12/W22544307p_1765918800.pdf (дата обращения: 27.02.2026). – Текст : электронный.
4. Стратегия развития государственной молодежной политики Республики Беларусь до 2030 года : постановление от 19 июня 2021 г. № 349 // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – URL: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=C22100349 (дата обращения: 16.04.2025). – Текст : электронный.
5. Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце "Беларуская мова" для X–XI класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання (базавы ўзровень) / зацв. 29.07.2025 № 134 // Национальный образовательный портал / Академия образования – URL: https://adu.by/images/2025/08/Uchebnye_programmy/Uch-pr-Bel-yaz-10-11-baz-uroven-2025.pdf (дата обращения: 25.11.2025). – Текст : электронный.
6. Зеленко, О. В. Формирование функциональной грамотности как научная и образовательная проблема / О. В. Зеленко, В. Ф. Русецкий // Веснік адукацыі. – 2020. – № 9. – С. 15–21.
7. Беларуская мова : вучэб. дапаможнік для 11-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, Л. С. Васюковіч, В. У. Зелянко [і інш.]. – Мінск : Народная асвета, 2023. – 183 с.
8. Беларуская мова : вучэб. дапаможнік для 10-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, Л. С. Васюковіч, В. У. Зелянко [і інш.]. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2020. – 230 с.
9. Васюковіч, Л. С. Праца з тэкстам як аснова фарміравання функцыянальнай пісьменнасці вучняў : манагр. / Л. С. Васюковіч. – Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2024. – 177 с.

## THE BELARUSIAN LANGUAGE TEXTBOOK AS A MEANS OF SHAPING STUDENTS' VALUE ORIENTATIONS

*Andreychyk V. I.*
*Minsk, Republic of Belarus*
*State Educational Institution "Academy of Education"*

***Summary.*** *The article analyses the methodological means of forming value orientations in Belarusian language textbooks for grades X–XI as a way of developing the student's personality as a bearer of national and universal human values.*

***Key words:*** *value orientations; axiological potential; Belarusian language textbook; state foundational documents.*

УДК 378

## МЕДИАГРАМОТНОСТЬ КАК ЧАСТЬ ИССЛЕДОВАТЕЛЬСКОЙ ФУНКЦИИ УЧИТЕЛЯ ИНОСТРАННОГО ЯЗЫКА

*Арзамасова А. Я.*
*Новосибирск, Российская Федерация*
*НИПКиПРО*

***Аннотация.*** *Данная статья рассматривает взаимосвязь между медиаграмотностью и исследовательской деятельностью педагога. Показано, что развитие медиаграмотности способствует формированию аналитических навыков, критического мышления и умений работать с информацией и медиа-материалами. Делается вывод о том, что медиаграмотность является фундаментальной для формирования исследовательских компетенций педагога и развития навыков самостоятельной работы в условиях цифровой эпохи. Автором предлагаются разработанные рекомендации по развитию медиаграмотности педагогов.*

***Ключевые слова:*** *исследовательская функция педагога, медиаграмотность, современный урок.*

В последние десятилетия технологии стремительно развиваются и их влияние на образовательный процесс становится все более заметным. Особенно актуально это влияние в условиях дистанционного обучения и повышения квалификации, где цифровые технологии становятся не только инструментом, но и основным средством взаимодействия между учителем и учени-